УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73
К666

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 7 ад 29.03.05)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *П. А. Тупік*

**Корзюк, А. А.**
К666 Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII – пачатак XX ст.) : метад. дапам. / А. А. Корзюк; пад навук. рэд. І. І. Багдановіча. — Мн. : БДПУ, 2005. — 47 с.

У дапаможніку прапанаваны разнастайныя варыянты ўрокаў, змешчаны праблемныя заданні. Даюцца фрагменты з твораў мастацкай літаратуры. Выкарыстаны вопыт вывучэння ваенна-гістарычнага і культурна-гістарычнага матэрыялаў.
Адрасуецца студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ.

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73

© Корзюк, А. А., 2005
© ВВЦ БДПУ, 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**А. А. Корзюк**

# ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ШКОЛЕ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX ст.)

*Метадычны дапаможнік*

8991
Бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

Мінск 2005

Я вам скажу, чаму. Кожны раз чалавецтва бліжэй да шчасця... на вышыню нашых магіл. З крывёю, са стогнамі на дно прорвы, яно, здыхаючы, паўзе да праўды...

(Цыт. па кн.: Караткевіч У. Кастусь Каліноўскі. / Зб. тв. у 8 т. Т.8, кн.1. Мн., 1990.)

У канцы урока адбываецца падагульняючая дыскусія на падставе ўбачанага і пачутага вучнямі па наступных пытаннях:

- Чаму так трагічна складваўся гістарычны лес Беларусі?
- Ці канчаткова, на ваш погляд, сфарміравалася беларуская нацыя? Чаму?
- Ці захаваюцца Беларусь і беларусы ў 21 стагоддзі?

Урок завяршается вершам – заклікам Я.Купалы "Моладзі":

На цябе, наша моладзь, надзея
Нашай сумнай забранай зямлі;
Твой арліны палёт цьмы развее
І запаліць веквечны агні.

Ты разбудзіш прыспаныя сілы
І на вольны паклічаш простор
З забыцця беспрасветнай магілы
Да бліскучага сонца, да зор.

Ты на бацькаўскім, моладзь, кургане
Узнясеш нездабыты пасад,
Што расточыць свае панаванне
На ўвесь край, дзе сягне твой пагляд.

Табе будуць не страшны заломы,
Злыя ворагі, іх варажба:
Долю, праўду з маланак і громаў
Твае выкрасяць гарт, барацьба.

Схамянайся ж ты, моладзь арліна!
У бок другі віхры веяць прымусь,
Бяры светач, ідзі за судзьбінай,
Ідзі з словам святым: Беларусь!

(Цыт. па кн.: Купала Я. Жыве Беларусь. Мн., 1993, с.256.)

Зразумела, што ўрок такога тыпу патрэбна рыхтаваць загадзя. Асноўная падрыхтоўка да яго правядзення заключаецца ў арганізацыі інсцэніровак па 1 або 2 прапануемых драматычных творах, падрыхтоўцы касцюмаў, а таксама вучняў-чытачоў, якія будуць дэкламаваць вершы ў пачатку і ў канцы ўрока.



**Тэмы "Адукацыя і навука ў 60-я – 90-я гады." (§18). "Літаратура і мастацтва." (§19).**

Для фарміравання цэласных уяўленняў пра развіцце беларускай культуры ў другой палове 19 ст., развіцця пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці вучняў прапануецца правесці ўрок-канферэнцыю "Культура Беларусі ў другой палове 19 ст." працягласцю 2 гадзіны. Такая форма правядзення ўрока будзе спрыяць характарыстыцы ходу развіцця беларускай культуры, яе здабыткаў і дасягненняў у другой палове 19 ст. у параўнанні з умовамі яе развіцця ў першай палове 19 ст.; удасканаленню навыкаў аналізу, характарыстыкі і ацэнкі гістарычных і культурных з'яў, падзей, асоб; уменняў падрыхтоўкі паведамлення і вуснага выступлення з ім, вядзення дыскусіі і фармулёўкі вывадаў, параўнання гістарычных з'яў і падзей. На наш погляд, менавіта ўрок-канферэнцыя дасць магчымасць настаўніку працягнуць і актывізаваць выхаванне эстэтычнай культуры вучняў, гуманістычнага мыслення, павагі да культурнай спадчыны беларускага народа.

Для таго, каб плануемы ўрок быў накіраваны на паспяховае выкананне яго мэтаў і задач, за адзін–два тыдні да яго правядзення неабходна правесці падрыхтоўчы этап:

1. Вучні ўсяго класа атрымліваюць хатняе заданне на паўтарэнне – паўтарыць § 7-9 (пра развіццё культуры Беларусі ў 1 пал. 19 ст.).

2. Група вучняў атрымлівае асобнае заданне па падрыхтоўцы паведамленняў па вывучаемаму новаму матэрыялу:

1) Сістэма адукацыі на Беларусі ў 2 пал. 19 ст. (у параўнанні з 1 пал. 19 ст.).
2) Уклад П.Шэйна і І.Насовіча ў развіцце беларусазнаўства.
3) К.Каліноўскі – пачынальнік рэвалюцыйнай публіцыстыкі.
4) Ф.Багушэвіч – першы класік новай беларускай літаратуры.
5) Шлях Я.Лучыны і А.Гурыновіча да Беларусі.
6) Генеалагічныя сувязі і культурная пераемнасць роду Кастравіцкіх – Апалінэраў.
7) Новыя рысы ў развіцці мастацтва 2 пал. 19 ст.

На ўроку і пры яго падрыхтоўцы акрамя падручніка могуць быць выкарыстаны разнастайныя сродкі навучання: карта Беларусі, зборнікі твораў Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны, ілюстрацыі карцін мастакоў другой паловы 19 ст., архітэктурных пабудоў гэтага часу.

У пачатку ўрока праводзіцца актуалізацыя ведаў вучняў аб галоўных рысах развіцця беларускай культуры ў першай палове 19 ст.:

- Якімі былі гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры ў другой палове 19 ст.? Параўнайце іх з першай паловай 19 ст.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ